Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-10-16

# Перавыдадзены першы мастацкі твор пра Першую сусветную

***Першая сусветная вайна, якая сто гадоў таму называлася Вялікая вайна, віхураю пранеслася па нашых землях і прынесла беларускаму народу незлічоныя людскія страты, гора ды пакуты. Сотні тысячаў працаздольных беларусаў былі вымушаныя зведаць гаротную долю бежанцаў. Многія з іх так і не вярнуліся да роднага дому. Тэме вайны, тэме чалавека на вайне, гераізму і мужнасці салдатаў прысвечана нямала твораў рускай і еўрапейскай літаратуры. Сваё адметнае слова пра гэтую трагічную падзею сказалі і беларускія паэты і празаікі. Сярод іх – Максім Гарэцкі, аўтар выдатнага дакументальна-мастацкага твора «На імперыялістычнай вайне» з адметным выразным падзагалоўкам: «Запіскі салдата 2-й батарэі N-скай артылерыйскай брыгады Лявона Задумы». Аповесць можна разглядаць як надзейную крыніцу вывучэння гісторыі вайны 1914 – 1918 гг. Асоба аўтара, яго талент мастака-гуманіста служаць гарантамі суровай праўды, адлюстраванай у творы.***

Ваенныя запіскі створаныя ў 1914 – 1919 гг., фрагменты друкаваліся ў часопісе «Полымя», першае асобнае і цэлае выданне выйшла ў 1926 г. Гэта адзін з першых у свеце мастацкіх твораў, напісаных пра тыя падзеі; раман Эрыха Марыі Рэмарка «На Заходнім фронце без пераменаў» выйшаў толькі ў 1929 г. Сёлета аповесць М. Гарэцкага пабачыла свет у выдавецкім доме «Беларуская навука». Прэзентацыя новага выдання адбылася 7 кастрычніка ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі ў рамках Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні», арганізаванай Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.


МАКСІМ ГАРЭЦКІ
НА ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЕ
(ЗАПІСКІ)
ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК—1926

***Тытул першага выдання «На імперыялістычнай вайне»***

У імпрэзе бралі ўдзел укладальнік выдання – кандыдат філалагічных навук Тэрэза Голуб, навуковы рэдактар член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхась Мушынскі, акадэмік Радзім Гарэцкі, іншыя навукоўцы і знаўцы беларускай літаратуры.

З нагоды правядзення Міжнароднай навуковай канферэнцыі ЦНБ НАН Беларусі падрыхтаваная таксама выстаўка «Першая сусветная вайна – гістарычны час на старонках літаратуры». Арганізатары звярнуліся да літаратурных і гістарычных крыніцаў: мастацкіх твораў М. Гарэцкага, Кандрата Крапівы, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Алеся Гаруна і іншых, а таксама – да хронік, успамінаў і мемуараў відавочцаў падзеяў той даўняй вайны.

*Падрыхтаваў Уладзімір ПІРОГ*


***М. Мушынскі***


***Р. Гарэцкі***

Уладзімір Пірог. Перавыдадзены першы мастацкі твор пра Першую сусветную